# БЕЛАРУСКІЯ ВЫДАННІ ПАЧ. XX ст. АБ НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЗЯРЖАЎНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ

***Н. А. Зубчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспуліка Беларусь,*
*Zubchon@bsu.by*

У артыкуле на аснове аналізу зместу першых беларускіх дэмакратычных выданняў разглядаецца пытанне нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі ў кантэксце сацыяльна-палітычных падзей пачатку XX ст.

***Ключавыя словы:*** дзяржава; публіцыстыка; нацыянальнае развіццё; «Наша доля»; «Наша ніва»; «Homan».

# BELARUSIAN PERIODICALS ON NATION BUILDING IN THE EARLY TWENTIETH CENTURY

***N. A. Zubchonak***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. A. Zubchonak (Zubchon@bsu.by)*

Based on the analysis of the content of the first Belarusian democratic periodicals, the article examines the issue of national-state building of Belarus in the context of socio-political events of the early twentieth century.

***Key words:*** state; social and political journalism; national development; «Nasha Dolja»; «Nasha Niva»; «Homan».

З пачатку XX ст. адным з самых актуальных для Беларусі стала пытанне стварэння дзяржавы. З часоў былой магутнасці Вялікага Княства Літоўскага прайшло шмат часу, палітыка русіфікацыі адмоўна адбілася на сацыяльным жыцці народа, на яго светаадчуванні, прытупіла свядомасць, пачуццё нацыянальнай годнасці. Менавіта таму першыя нацыянальныя выданні, акрамя культурна-асветніцкіх задач, паставілі перад сабой мэту распрацоўкі праграмы дзяржаўнага будаўніцтва.

Першы крок быў зроблены «Нашай доляй»: «Мы аб’яўляем вайну ўсім цёмным сілам, каторым дзеля карысці сваёй вялікая выгада была трымаць васьмімільённы народ беларускі ў нядолі і паняверцы, баламуціць і дурыць яго» (Наша доля, 1906, № 1). Гэта і быў заклік да прагрэсіўнай грамадскасці прыступіць да актыўнай працы.

«Наша ніва» паспяхова прадоўжыла распачатую справу. На старонках газеты былі прадстаўлены асноўныя напрамкі будаўніцтва беларускай нацыянальнай дзяржавы. Пазіцыя рэдакцыі ў гэтым пытанні былі вельмі моцнай. Гісторыя ўжо неаднойчы пацвярджала: ва ўсе складаныя перыяды беларускай гісторыі аб’ектам увагі станавілася «Наша ніва», яе праграма і публіцыстыка.

Значэнне і роля «Нашай нівы» была і застаецца вельмі значнай. Практычна ўсе беларускамоўныя выданні пач. ХХ ст. развіваліся пад уплывам «Нашай нівы» (ідэйна, матэрыяльна). Самыя таленавітыя, прагрэсіўныя і адукаваныя людзі прыйшлі працаваць менавіта ў «Нашу ніву». І нарэшце, ні час, ні змена ўлады ў краіне не здолелі перакрэсліць гэты перыяд. Ён так і застаўся «нашаніўскім» і ў 30-я гады, і ў 90-я, у развіцці новай літаратуры, мовы, у станаўленні публіцыстыкі, у фарміраванні дзяржаўнай ідэалогіі, у беларускай гісторыі. Безумоўна, агульны фон публіцыстыкі стваралі менавіта ўсе выданні ў сукупнасці. Можна сярод іх выдзеліць больш прагрэсіўныя ці менш прагрэсіўныя, тыя, якія ўпэўнена крочылі наперад у сваіх меркаваннях («Наша доля», «Наша ніва», «Маладая Беларусь»), і тыя, якія выбіралі ўласныя шляхі да грамадства («Belarus», «Homan», «Svetac»). У кожнай дзяржаве нацыянальная палітыка накіравана на рэалізацыю нацыянальных інтарэсаў і ліквідацыю супярэчнасцей. «Развіваць культуру і выяўляць свае творчыя сілы кожная нацыя можа толькі тады, калі ёй дадзена на гэта галоўная воля. Поўная свабода культурна-нацыянальнага развіцця – гэта першы варунак для развіцця такога краю», – пісала «Наша ніва» ў 1912 г. (№ 28–29).

Падзел тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю на дзве зоны вайсковага супрацьстаяння паміж Расіяй і Германіяй паўплываў на змест асноўных ідэй адраджэнцаў. Вільня была акупавана немцамі. У шэрагах нацыянальнай інтэлігенцыі развівалася ідэя магчымага ўзнаўлення дзяржаўнай уніі Беларусі і Літвы. У снежні 1915 г. быў выдадзены зварот «Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага». Тут жа, у Вільні, быў створаны Беларускі нацыянальны камітэт як арганізацыйны цэнтр мясцовых беларускіх арганізацый. Ён здолеў наладзіць сувязі з літоўскім, польскім, яўрэйскім нацыянальнымі рухамі.

У лютым 1916 г. было наладжана выданне газеты «Homan», рэдактарам якой стаў В. Ластоўскі. Ад імя беларускай палітычнай арганізацыі «Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі» на міжнароднай канферэнцыі ў швейцарскай Лазане прагучаў «Мемарандум прадстаўнікоў Беларусі» (1916 г.). У прамове беларускіх дэлегатаў (І. Луцкевіч і В. Ластоўскі) да ўдзельнікаў міжнароднай сустрэчы абгрунтоўваліся правы беларускага народа на незалежнасць і дзяржаўную самастойнасць: «Цяпер, дзякуючы ІІІ-яй канфедэрацыі народаў, мы маем магчымасць першы раз за 120 гадоў заявіць цывілізаванаму свету аб поўнай нашай бяспраўнасці, ад якой мы пакутавалі ў Расійскай дзяржаве. Мы просім у цывілізаваных народаў спагады нам і падтрымкі, каб прымусіць да пашаны нашых нацыянальных і культурных правоў. Мы можам урэшце спадзявацца, што які б ні быў канец вайны, народы Еўропы памогуць нам забяспечыць Беларусі ўсе палітычныя і культурныя правы, якія дадуць нашаму народу магчымасць вольна развіваць свае інтэлектуальныя, маральныя і эканамічныя сілы, і што гэтыя правы дадуць нам магчымасць стаць гаспадарамі на нашай уласнай зямлі» [1, с. 28].

Падзеі Першай сусветнай вайны ўскладнілі палітычную абстаноўку ў Паўночна-Заходнім краі. Нават пагроза паражэння ў вайне не прымусіла ўрады Расіі і Польшчы адмовіцца ад сваіх прэтэнзій на беларускія землі. Беларускае пытанне па-ранейшаму заставалася ў полі іх павышанай цікавасці.

На старонках газеты «Homan» друкаваліся публікацыі, у якіх выказвалася падзяка нямецкаму ўраду за апеку над беларускім рухам. У той час, калі лілася кроў і гінулі тысячы людзей, гэта выглядала як здзек з народа. У № 6 за 1916 г. рэдакцыя надрукавала паведамленне аб тым, што фельдмаршал Гідэнбург, галоўнакамандуючы Усходнім фронтам, выдаў указ аб адкрыцці школ. Ва ўказе гаварылася, што беларуская мова, як адметная ад расійскай, дапускаецца да ўжытку без ніякіх перашкод. Са згоды нямецкага камандавання адкрываліся школы, у царкве дазвалялася весці богаслужэнне па-беларуску. Газета змяшчала паведамленні аб тым, што і нямецкія выданні распаўсюджвалі матэрыялы аб беларускім руху, спачувалі беларусам, падтрымлівалі іх у гэтай справе («Homan», 1916, № 3, № 5, № 7, № 8, № 9 і г. д.). У адным з такіх артыкулаў рэдакцыя расказвала, што нямецкія выданні ўсё часцей пішуць пра беларускі рух, лічаць яго вельмі значным, выказваюць упэўненасць, што беларуская справа знойдзе яшчэ лагічнае

завяршэнне і будзе садзейнічаць краху Расійскай імперыі. У якасці прыкладу прыводзіўся факт, што Напалеон пацярпеў свае першыя няўдачы менавіта ў Беларусі («Homan», 1916, № 17).

Так, у выніку скасавання забароны на беларускую мову на акупаванай тэрыторыі было адкрыта каля 300 беларускіх школ, пачала работу ў м. Свіслач Гродзенскай губерні першая беларуская семінарыя, у Вільні ўзнавіла дзейнасць забароненае ў свой час Беларускае выдавецкае таварыства. Быў створаны шэраг беларускіх арганізацый, у іх ліку Беларускі клуб, Таварыства дапамогі бедным дзецям «Золак», Навуковае беларускае таварыства, Беларускі настаўніцкі саюз і інш.

Не трэба думаць, што нямецкія ўлады клапаціліся аб развіцці і росквіце нашай культуры. Немцы былі зацікаўлены падарваць і паменшыць расійскі ўплыў на Беларусі. Абмежаванні пры карыстанні рускай мовай і свабоднае ўжыванне беларускай мовы якраз адпавядалі гэтым намерам. А паколькі рускую мову замяніць нямецкай было немагчыма, таму немцы і пайшлі на скасаванне ўсіх абмежаванняў у адносінах да беларускай мовы.

«Патрэба газеты адчуваецца наймацней тады, калі наступаюць часы важных перамен, калі ідзе справа аб долі народаў. Беларускі край цяпер перажывае якраз такі вялікі гістарычны момант: перад намі адкрываецца шырокі прастор для працы, і ў гэты момант больш, чым калі, патрэбна нам беларуская газета» («Homan», 1916, № 1). Усплеск адраджэнскай актыўнасці, звязаны з дзейнасцю віленскага асяродку нацыянальнай інтэлігенцыі, стаў апошнім напярэдадні лютаўскай і кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г.

Слова друкаванае валодае магутнай сілай, здольнай зрушыць з месца народ, разбудзіўшы ў ім пачуццё нацыянальнай годнасці, імкненне да адраджэння самасвядомасці, жаданне змагацца за ўсталяванне ў краіне асноў нацыянальнай дзяржаўнасці. Беларускі народ прайшоў праз розныя этапы свайго станаўлення і развіцця. Не заўсёды вынікі былі станоўчымі. Гісторыя захавала дастаткова інфармацыі пра асобныя падзеі, якія напрамую пераклікаюцца з сучаснасцю і патрабуюць глыбокага асэнсавання.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Турук Ф.* Белорусское движение:очерк истории национального и революционного движения белорусов. Менск : Гос. изд-во, 1921. 145 с.